Што хвалюе акадэміка Генадзя Міхайлавіча Лыча – чытайце на 2-й стар.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадо...
Якуб КОЛАС

№ 14 (4472)

18 лютага 2020 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.



Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

АКТУАЛИИ

Светлана КАЛИНКИНА

Начинай сначала

Официальные лица долго отрицали, что Россия вынашивала планы по инкорпорации Беларуси. Нас настойчиво убеждали, что белорусскому суверенитету ничего не угрожает и «не надо нагнетать». Но наконец и Александр Лукашенко признался.

В конце декабря в интервью «Эхо Москвы» он сообщил, что «31-я дорожная карта белорусско-российской интеграции – это план строительства союза с наднациональными органами». Новость так себе, для понимающих. Но в конце прошлой недели Лукашенко высказался доступным языком: *«Они* (Россия. – **Прим.**) *понимают интеграцию как поглощение Беларуси. Это не интеграция! Это инкорпорация! На это я никогда не пойду».*

Сейчас складывается впечатление, что белорусский лидер долго не осознавал, к чему ведут все эти интеграционные завлекухи. И шел на манок, аки лось на охотников. По крайней мере теперь, когда Лукашенко открыто заявил, что на инкорпорацию не пойдет, в России его не поняли даже те, с кем он был на «ты» и вел долгие задушевные беседы.

Вот, например, Константин Затулин, депутат Госдумы, директор российского Института стран СНГ и еще недавно – большой сторонник белорусского лидера. Теперь он называет Александра Лукашенко «перерожденцем».

«Если среди нас (россиян) есть люди, которые смотрят влюбленными глазами на Лукашенко, предложу им такой взгляд на Лукашенко. Александр Лукашенко по-настоящему влюблен в Беларусь, и это не дает ему возможности смотреть объективно ни на Беларусь, ни на себя, ни на возможности экономики. {...} Безусловно Александр Григорьевич перерожденец, если говорить о нем как о патриоте. Он успешно выстроил свою систему. Она, конечно, внутри Беларуси имеет свои трещины, она зиждется на российских дотациях. Он понимает, что без них будет гораздо сложнее, что никто ему за красивые глаза ничего не даст. Но он все равно пытается», – говорит теперь Затулин.

Если Лукашенко любит Беларусь, то он, по-затулински, плох! Вот такая постановка вопроса. Но Затулин, надо признать, высказался дипломатично. В целом российские СМИ сейчас переполнены резкими и даже оскорбительными комментариями в адрес главы белорусского государства. Только сам Владимир Владимирович Путин молчит. Правда, на его счет обманываться и вовсе не стоит. Как пояснил все тот же Константин Затулин: *«Лукашенко продолжает игру. Мы в эту игру включились. Никто на официальном уровне не отвечает на выпады Лукашенко. Но от этого Александр Григорьевич все больше входит в раж. Он все ждет, когда кто-то с ним поссорится, а никто с ним на официальном уровне не ссорится».*

В общем, Лукашенко ругается, а Путина – хоть к ране прикладывай: соком поит, кашкой угощает, добр и мил… Лукашенко говорит, а Путин делает. Так задумано. Тут и стратегия, и тактика.

Последние события показали, что у Лукашенко в России остался только один союзник – Геннадий Зюганов. Только главный коммунист решился хоть как-то заступиться за белорусского лидера и обрушился с критикой на внешнюю политику Кремля. *«Я не мыслю наше будущее без сложения потенциала России, Украины, Беларуси и Казахстана. Когда нас будет 220 миллионов человек, нам будут открыты все мировые рынки, и будем мы конкурентоспособны. А когда у вас отношения с Беларусью натягиваются только потому, что вы торгуетесь, за сколько газ продать…»* – возмущался Зюганов на недавней пресс-конференции. Вроде бы в нефтегазовом вопросе он на стороне Беларуси, но, сами понимаете, союзничек еще тот.

Что в итоге мы имеем?

Никакого пробелорусского лобби в России нет. Все те, кого Лукашенко годами кормил, поил, встречал, обхаживал, одаривал подарками, отвернулись от него, едва только вопрос о будущем белорусского государства встал ребром.

Российские медиа и комментаторы в соцсетях быстро нашли себе нового врага. Пока не Беларусь и не белорусов, но Александра Лукашенко лично. Он теперь у них «предатель», «перерожденец», «лжец» и «перебежчик».

Но главное – это новая реальность, в которой мы оказались. Как на Западе, так и на Востоке теперь перекрыта главная статья белорусского экспорта – экспорта сказок. Сказок про движение к демократии для одних, про стремление к интеграции – для других. По сути, выстраивание внутренней и внешней политики надо начинать сначала. Не наступить бы на те же грабли.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Як ідзе падрыхтоўка да Дня Волі?

Арганізатары распавялі пра планы і мерапрыемствы ў сувязі са 102-й гадавінай БНР.

Юрась ГУБАРЭВІЧ: «10 працэнтаў неабходнай сумы ўжо сабралі»

– У Мінгарвыканкам пададзена заяўка на правядзенне мерапрыемстваў ад імя шэрагу арганізацый, – кажа старшыня руху “За Свабоду” **Юрась Губарэвіч**. – Акрамя нашага руху арганізатарамі святкавання будуць Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) і партыя “Зялёныя”.

Трэба адзначыць, што заяўка не ад фізічных асоб, а ад арганізацый дазваляе легальна збіраць больш за тысячу чалавек.

Таксама заявілі адно месца святкавання, якое не ўваходзіць у пералік вызначаных месцаў кшталту Кіеўскага сквера альбо парку імя 50-годдзя Кастрычніка. Яно больш-менш зручнае і, скажам так, тусовачнае.

– Што гэта за месца?

– Пакуль не буду раскрываць карты, бо практыка мінулых гадоў паказвае: калі папярэдне называеш дату, час і месца правядзення мерапрыемства, то ва ўлад з’яўляецца падстава адмовіць нам.

Таму спачатку дачакаемся станоўчага адказу Мінгарвыканкама, а затым ужо абнародуем інфармацыю і будзем праводзіць актыўную кампанію па зборы сродкаў, якая, да слова, і так ужо ідзе. Каля 10 працэнтаў неабходнай сумы ўжо сабрана.

– Колькі ўвогуле трэба грошай?

– Паводле нашых падлікаў, каля 25 тысяч рублёў. Гэтыя грошы могуць забяспечыць і добрую якасць музычнага абсталявання, і сцэну, і запрашэнне музыкантаў. Хаця не выключаю, што могуць з’явіцца і дадатковыя выдаткі, якія, паводле заканадаўства, арганізатары павінны несці.

– Наколькі масавым плануеце зрабіць мерапрыемства?

– Калі атрымаем дазвол на святкаванне ў тым месцы, дзе запланавалі, то, думаю, людзей прыйдзе больш, чым у мінулым годзе.

– Можа, ужо вядомы тыя спевакі альбо гурты, якія пагадзіліся выступіць на Дзень Волі?

– Канкрэтных дамоўленасцяў пакуль няма, перамовы працягваюцца.



Павел БЕЛАВУС: «Мы ў гэты воз упрагацца не будзем»

– Нешта да Дня Волі мы, безумоўна, правядзём, але пакуль не вядома, што канкрэтна, – кажа кіраўнік “Арт-сядзібы”, адзін з арганізатараў святкавання ў гонар 100-годдзя БНР **Павел Белавус**. – Гэтым будзем займацца крыху пазней, бо зараз цалкам сканцэнтраваліся на арганізацыі мерапрыемстваў да Дня роднай мовы, якія мы адзначым 22 лютага.

Як раней паведамлялася, у гэты дзень адбудзецца шматтысячны “MovaFest” – унікальнае мерапрыемства, якое аб’ядНае бізнесменаў, грамадскіх актывістаў, творчую інтэлігенцыю і проста актыўных жыхароў Беларусі вакол адной тэмы – беларускай мовы. Падчас фестывалю мы пакажам і раскажам пра з’явы, крэатыўныя прадукты і рэчы, якія ствараюцца па-беларуску ці з выкарыстаннем роднай мовы.

Што тычыцца Дня Волі, то нейкія грандыёзныя мерапрыемствы дакладна ладзіць не будзем і канкурыраваць ні з кім не збіраемся. У нас ёсць некалькі ідэй, але вырашаем, у якім фармаце гэта зрабіць.

– Не збіраецеся далучыцца да палітыкаў, якія арганізоўваюць мітынг-канцэрт?

– Калі яны ўжо пацягнулі на сябе коўдру, то няхай у гэтым годзе ладзяць свята без нас. Паглядзім, што ў іх атрымаецца, а мы ў гэты воз упрагацца не будзем.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СКАЗАНО!



Александр ЛУКАШЕНКО:

– Помните, что ваш Президент никогда не станет последним. После меня вы уже думайте, что будете делать. Но даже если я буду жить и не буду Президентом, я буду бороться за то, чтобы наша Беларусь на этом клочке земли оставалась суверенной и независимой. Нами никогда не будут понукать, мы будем проводить свою внешнюю и внутреннюю политику, но не во вред нашим соседям и не во вред родным россиянам. Мы будем и дальше работать по интеграции. Но по настоящей интеграции, а не так, как «плявузгаюць» в средствах массовой информации в России. Они понимают интеграцию как поглощение Беларуси Россией. Это не интеграция! Это инкорпорация! На это я никогда не пойду!

Это заявление Александра Лукашенко сотрудники предприятия встретили громкими и дружными аплодисментами.

(Во время посещения Светлогорского целлюлозно-картонного комбината.)

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Суд по делу экс-начальника Службы безопасности президента будет открытым

Хотя Андрей Втюрин и его адвокат настаивали на том, чтобы разбирательство шло в закрытом режиме.

Втюрин считает, что в материалах дела содержатся секретные данные, которые относятся ко времени его службы в Совете безопасности.

Однако ходатайство адвоката и просьбу бывшего президентского охранника не удовлетворили.

Уголовное дело по многочисленным фактам получения и дачи взяток в ходе поставок в Беларусь телекоммуникационного оборудования, компьютерной техники и программного обеспечения в отношении 16 персон Верховный суд начнет рассматривать 10 марта в открытом выездном судебном заседании на территории суда Московского района Минска.

Сегодня Андрей Втюрин находится под стражей. Ему, в отличие от некоторых из тех, кто проходит с ним по одному делу, не изменили меру пресечения. Под стражей находится также экс-гендиректор «Белтелекома» **Сергей Сиводедов.**

Кроме Втюрина и Сиводедова фигурантами уголовного дела являются начальник главного управления платежной системы и цифровых технологий Нацбанка **Игорь Кудасов**, директор информационно-вычислительного центра Минфина Беларуси **Юрий Зданевич**, начальник управления информационной безопасности департамента безопасности «Беларусбанка» **Алексей Милованов**, исполнительный директор банка БелВЭБ **Юрий Пономарев,** руководитель ООО «Мобильный сервис» **Владимир Жилин** – его обвиняют в даче взяток в общей сумме свыше 900 тысяч долларов!

В качестве взяткодателей по уголовному делу также проходят совладелец и один из фактических руководителей фирм «Солидекс ПИ» и «Солидекс» **Сергей Покрышко**, гражданин Латвии и совладелец СООО «ДПА» **Сергей Шарков**, представитель ООО «Мобильный сервис» **Александр Бровка**, представитель компаний «Смартлабс» и «УГМК-Телеком» россиянин **Виталий Горбачев** и директор ООО «ТТ-Связьком» **Владимир Томченко**.

С экс-главой «Белтелекома» Сергеем Сиводедовым было заключено досудебное соглашение, на предварительном заседании в суде он заявил, что возместил денежные средства.

Досудебные соглашения также были заключены с председателем правления ОАО «Белорусский межбанковский расчетный центр» **Феликсом Касперовичем**, замначальника главного управления информационных технологий Нацбанка **Андреем Подгорным**, представителем ИИУП «АМТ-Груп Интернешнл» **Михаилом Пригара** и с россиянином **Владимиром Казанцевым**, представителем компаний «Смартлабс» и «УГМК-Телеком».

Феликс Касперович обвиняется в получении совместно с **Андреем Подгорным** взяток на сумму более 868 тысяч долларов. **Сергей Сиводедов**, по мнению следствия, получил не менее 470 тысяч долларов и 15 тысяч евро.

Михаил Пригара обвиняется в даче взяток на общую сумму 285 тысяч долларов, а **Владимир Казанцев** – в передаче не менее 190 тысяч.

В Генеральной прокуратуре уточнили, что Втюрин лоббировал интересы российских коммерческих структур по поставкам оборудования для «Белтелекома».

Андрею Втюрину 49 лет. Он родился в Пензе (Россия). В 1992 году окончил Саратовское высшее военное командное училище МВД России. Начальником Службы безопасности президента Андрей Втюрин был назначен летом 2007 года. До этого он руководил управлением личной охраны президента. Втюрин женат, у него есть взрослый сын. Имущество Втюрина, в том числе и дом на улице Вербной, находится под арестом.

Кстати, Андрей Втюрин признал свою вину и сотрудничал со следствием.

Даша ПАВЛОВСКАЯ.

ІНІЦЫЯТЫВА

І летам – са снегам

У Мінску пабудуюць першы ў Беларусі крыты лыжны манеж. Там нават летам будзе мінус 4 градусы.

Праектаванне будынка пачнецца ў бліжэйшы час (яно зойме не больш за два гады). А пакуль перадпраектную візуалізацыю ўхваліў Мінгарвыканкам, паведамляе tut.by.

Лыжны манеж збіраюцца ўзвесці за Вярхоўным судом паміж Арлоўскай вуліцай і Свіслаччу. Яго памеры складаюць 150 на 90 метраў, плошча – каля 23 тысяч квадратных метраў. Лыжная траса размесціцца на трох узроўнях, яе працягласць складзе 1,3 кіламетра. Запланаваны пляцоўка для катання на каньках і спуск для сноўборда вышынёй больш за 13 метраў.

Адначасова ў манежы змогуць адпачываць 365 чалавек.

СТАЛО ИЗВЕСТНО

Центр медицинской реабилитации «Загорье» принял китайских студентов

Вчера вечером в Минском областном центре медицинской реабилитации “Загорье” поселились 32 китайских студента, которые вернулись на учебу в столицу Беларуси, но должны пройти карантин, связанный с коронавирусной инфекцией у них на родине.



Фото Сергея САЦЮКА, (БелаПАН).

ДЗЯРЖАЎНАЯ ПРАБЛЕМА

АРАКЧЭЕЎШЧЫНА

Генадзь Міхайлавіч Лыч – акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук, доктар эканамічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь.

“Народная Воля” запрасіла Генадзя Міхайлавіча ў госці напярэдадні яго 85-годдзя. Размова – пра тое, што хвалюе вядомага вучонага, пра праблемы нацыянальнай важнасці.



Не служыць ісціне, а дагаджаць начальнікам

– Генадзь Міхайлавіч, роўна пяць гадоў таму вы далі разгорнутае інтэрв’ю журналісту “Народнай Волі” Івану Паўлоўскаму, у якім падрабязна распавялі пра гаротны стан беларускай навукі. Нагадалі пра сур’ёзныя пагрозы, якія тоіць у сабе адставанне навукі ад патрабаванняў нашага найскладанейшага часу. Свае выказванні скончылі тады спадзяваннем, што беларуская навука ўсё ж пераадолее стрыножанасць і парадуе грамадства сур’ёзнымі дасягненнямі. Ці спраўдзіліся вашы спадзяванні?

– На вялікі жаль, ні адна з праблем, закранутых мной у папярэднім інтэрв’ю, за мінулыя пяць гадоў так і не была вырашана. Па-ранейшаму мы не можам быць задаволены ні колькасным, ні якасным складам навуковых кадраў. Не павысіўся прэстыж навукі і вучонага ў грамадстве. Захавалася празмерная абмежаванасць фінансавання навуковых даследаванняў і распрацовак. Застаецца нявырашанай праблема незапатрабаванасці вынікаў навукова-тэхнічнай дзейнасці айчынных вучоных і гэтак далей.

Больш за тое, адбылося істотнае абвастрэнне многіх праблем. Як ні прыкра, але ў Нацыянальнай акадэміі навук усё больш і больш прыжываецца аракчэеўшчына, якая праяўляецца ў жорсткай і згубнай дыктатуры яе кіраўніцтва. Адсюль – рэзкае пагаршэнне маральна-псіхалагічнага клімату ў навуковых калектывах. Раней гэтая праблема востра стаяла толькі ў прыкладной навуцы, што знаходзілася ў прамым падпарадкаванні міністэрстваў і ведамстваў. Апошнім часам яна распаўсюдзілася і на фундаментальную акадэмічную навуку.

– Растлумачце, калі ласка, якія прычыны абумовілі пагаршэнне маральна-псіхалагічнага клімату, прынамсі ў акадэмічнай навуцы і хто ў гэтым вінаваты?

– Я лічу, пачатак гэтаму працэсу палажыў Міхаіл Мясніковіч, прызначаны ўказам Аляксандра Лукашэнкі кіраўніком Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Зараз гэтую згубную справу не менш настойліва працягвае Уладзімір Гусакоў.

Зыходнай прычынай карэннага пагаршэння маральна-псіхалагічнага клімату ў акадэмічным асяроддзі паслужыла замена выбараў кіраўнікоў навуковых арганізацый і іх структурных падраздзяленняў прызначэннем іх у загадным парадку.

Тым самым Мясніковіч, па сутнасці, стварыў у межах НАН Беларусі адгалінаванне “прэзідэнцкай вертыкалі”, цалкам падпарадкаванае ягонай волі, а праз яго – волі кіраўніка краіны. Усё кіраўніцтва, напрыклад, эканамічнай навукі зверху данізу было пастаўлена перад жорсткай неабходнасцю забяспечваць бездакорнае правядзенне ў жыццё часовай дзяржаўнай палітыкі. Сапраўдныя ж інтарэсы навукі былі адсунуты на задні план, а кіраўнікі акадэмічных устаноў і іх структурных падраздзяленняў былі вызвалены ад усякіх абавязкаў перад падначаленымі калектывамі. Яны маглі асабліва не лічыцца ні з інтарэсамі, ні з меркаваннямі шараговых супрацоўнікаў.

З тым каб навуковыя супрацоўнікі былі больш паслухмянымі ў дачыненнях са сваімі непасрэднымі начальнікамі, Мясніковіч неўзабаве перавёў іх на кантрактную сістэму найму на працу. Выключэнне не было зроблена нават у адносінах да акадэмікаў, хоць гэта супярэчыла духу статута НАН Беларусі. Больш за тое, каб “прыручыць” акадэмікаў, ён нават зрабіў спробу дамагчыся надзялення сябе законным правам пазбаўляць іх гэтага высокага звання, прычым за самую дробязную правіннасць. І толькі актыўнае супрацьдзеянне часткі акадэмічнай эліты не дазволіла Мясніковічу здзейсніць гэтую каварную задуму.

Наступным – ужо пры Гусакове – крокам на шляху поўнага падпарадкавання навуковых калектываў волі вышэйшага дзяржаўнага кіраўніцтва сталі ўказ прэзідэнта “Аб камерцыялізацыі вынікаў навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, створаных за дзяржаўны кошт” ад 4 лютага 2013 года №59 і зацверджанае ім “Палажэнне аб камерцыялізацыі вынікаў навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці, створаных за кошт дзяржаўных сродкаў”. Паводле названых нарматыўна-заканадаўчых актаў пры незабеспячэнні дзяржаўным заказчыкам абавязковай камерцыялізацыі вынікаў навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці ў парадку і (ці) тэрміны, устаноўленыя ў Палажэнні, дзяржаўныя сродкі, за кошт якіх створаны дадзеныя вынікі, прызнаюцца выкарыстанымі з парушэннем бюджэтнага заканадаўства і падлягаюць спагнанню ў бясспрэчным парадку ў адпаведны бюджэт з налічэннем працэнтаў у памеры стаўкі рэфінансавання, устаноўленай Нацыянальным банкам на дату спагнання.

Пры гэтым дзяржаўныя чыноўнікі пастараліся абавязкі па ажыццяўленні камерцыялізацыі вынікаў навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці ўскласці на навукова-даследчыя арганізацыі, якія выступаюць у ролі галоўных арганізацый-выканаўцаў. І толькі ў выпадках, калі гэтыя вынікі звязаны з нацыянальнай бяспекай, адзначаныя абавязкі засталіся за дзяржаўнымі заказчыкамі. Адпаведна і матэрыяльная адказнасць за невыкананне ўстаноўленых патрабаванняў па камерцыялізацыі вынікаў навуковай і навукова-тэхнічнай дзейнасці таксама ўскладзена на навукова-даследчыя арганізацыі.

Такім чынам вучоныя былі пастаўлены ў поўную залежнасць ад дзяржаўных чыноўнікаў. Усе яны сёння пры пастаноўцы і ажыццяўленні навуковых даследаванняў і распрацовак павінны імкнуцца да атрымання вынікаў, пажаданых дзеючым уладам. У адваротным выпадку яны рызыкавалі стаць банкрутамі і спыніць сваю навукова-даследчую дзейнасць.

Дарэчы, памянёнымі вышэй нарматыўна-заканадаўчымі актамі чыноўнікі фактычна пазбавілі беларускіх вучоных права на памылку, без чаго ўвогуле нельга ўявіць сабе нармальную навукова-даследчую дзейнасць. Па сутнасці, гэта ўжо не навука, а рамяство, прызначанае не служыць ісціне, а дагаджаць начальнікам.

Марыянеткі не могуць быць вучонымі

– Генадзь Міхайлавіч, калі я правільна разумею, усё, што вы толькі што сказалі, наўпрост гробіць нашу айчынную навуку. Разам з тым я не чуў, каб нашы вучоныя гучна падалі свой голас у абарону навукі. Як такое магло стацца? Чым вы гэта можаце растлумачыць?

– Галоўнай прычынай, на маю думку, паслужыў страх, атрыманы вучонымі ў спадчыну ад сваіх бацькоў, якім давялося жыць у змрочныя гады сталінскіх рэпрэсій. У гэтым я пераконваўся не аднойчы.

Першы раз, калі спрабаваў угаварыць асобных з такіх, як я, пажылых акадэмікаў без кіраўніцкіх пасад, паставіць свой подпіс поруч з маім пад артыкулам “Царский подарок” ученым к Году науки”, падрыхтаваным мною па пытаннях, аб якіх я распавядаў вышэй. У другі раз – падчас апошняга Агульнага сходу Акадэміі, калі спрабаваў знайсці сярод адзначаных акадэмікаў згодных разам са мной паставіць подпіс пад пытаннямі да прэзідыума НАН Беларусі, чаму ён не прымае ніякіх захадаў, каб адвесці ад беларускай навукі пагрозы, якія тояць у сабе памянёныя вышэй нарматыўна-заканадаўчыя акты.

Дык вось, у першым выпадку ніхто з акадэмікаў, да якіх я звярнуўся са сваёй просьбай, так не адклікнуўся на яе. Хоць ніхто з іх і не сказаў, што ў маім артыкуле напісана штосьці не так. У другім выпадку знайшоўся толькі адзін акадэмік, які без аніякіх агаворак паставіў свой подпіс пад адзначанымі пытаннямі да прэзідыума НАН Беларусі. Другі акадэмік наадрэз адмовіўся, спаслаўшыся на тое, што калісьці бацька яго папярэджваў, каб ён ні ў якім разе не падпісваўся пад калектыўнымі лістамі і запытамі да органаў улады. Трэці палічыў падрыхтаваныя мной пытанні да прэзідыума дробязнымі, не вартымі ягонай высокай увагі. А да чацвёртага я сам не пайшоў, парваў паперу са сваімі пытаннямі і выкінуў яе ў урну, каб ненарокам не пашкодзіць першаму акадэміку.

Акрамя страху тут, канешне, сказалася і адсутнасць у акадэмікаў належнай адказнасці за лёс айчыннай навукі. Асабісты дабрабыт аказаўся для іх даражэйшым.

– Няўжо акадэмік зараз можа так многа страціць, аказаўшыся непажаданым уладам, што яму трэба падлашчвацца да іх, адмаўляючыся ад уласнай чалавечай і прафесійнай годнасці?

– Ва ўсякім разе гэтага сёння можа аказацца дастаткова, каб пазбавіцца пасады і нават быць вытурканым з Акадэміі. У тым, што сказанае мной не выдумка, а наша сённяшняя рэчаіснасць, можна пераканацца на маім вопыце. Так, падчас нашай з вамі гутаркі роўна пяць гадоў таму вы самі зазначылі, што дырэктар Інстытута эканомікі Нікіценка разам з тагачасным старшынёй прэзідыума НАН Беларусі Мясніковічам выпхнулі мяне з Акадэміі. А за што? Дый усё за тое ж самае: і аднаму і другому я аказаўся не даспадобы. Нікіценка ў той час з усіх сіл ухваляў кіраўніцкую дзейнасць беларускага ўрада, нават называў яго самым мудрым урадам ва ўсім свеце, а беларускую эканамічную мадэль лічыў настолькі дасканалай, што яе аўтара, маўляў, варта вылучыць кандыдатам на прысуджэнне яму Нобелеўскай прэміі ў галіне эканомікі. Мясніковіч прытрымліваўся такога ж пункту гледжання. У той час як я па-ранейшаму вышукваў недахопы ў дзяржаўнай эканамічнай палітыцы, з тым каб уносіць прапановы па яе ўдасканаленні. У дадатак безупынна крытыкаваў “рэфарматарскую” дзейнасць Мясніковіча. Вось Мясніковіч з Нікіціным і палічылі для сябе за лепшае вытурыць мяне з Акадэміі навук.

З 1 студзеня 2020 года я зноў аказаўся выпхнутым з Акадэміі. На гэты раз цяперашнім старшынёй прэзідыума НАН Беларусі Гусаковым і выконваючым абавязкі дырэктара Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі Піліпуком. Пры гэтым здзейсніць дадзеную задумку яны пастараліся самым абразлівым для мяне чынам.

Прыкладна за тыдзень да канца лістапада 2019 года Піліпук праз аддзел кадраў даслаў мне паперу, у якой паведаміў, што тэрмін майго кантракта заканчваецца 31 снежня, і папярэдзіў, што кантракт са мной не будзе працягнуты. Ён так і не знайшоў часу, каб падзякаваць мне за шматгадовую працу. Не кажучы ўжо пра тое, каб урачыста правесці мяне на заслужаны адпачынак на спецыяльна скліканым дзеля гэтага Агульным сходзе навуковага калектыву ці на пасяджэнні вучонага савета.

Пагадзіцеся, такое звальненне з працы акадэміка, які прапрацаваў у інстытуце больш за дваццаць гадоў, у тым ліку больш за дзесяць на пасадзе першага намесніка дырэктара інстытута па навуковай працы, які аднойчы, пакінуўшы любімую працу ў іншым інстытуце, якая прынесла яму ўсесаюзную вядомасць, перайшоў на працу ў дадзеную ўстанову дзеля таго, каб стварыць пры ёй савет па абароне кандыдацкіх дысертацый і такім чынам аблегчыць ягоным маладым супрацоўнікам вырашэнне задачы атрымання пажаданай навуковай ступені, не можа не ўражваць сваёй ганебнасцю. Праўда, асабліва глыбока яно мяне не кранула. Добра ведаючы, на што здольныя Гусакоў і яго падручныя, выконваючы ўказанні свайго “шэфа”, я маральна падрыхтаваў сябе нават да горшага.

– Генадзь Міхайлавіч, скажыце, калі не сакрэт: чым вы маглі так угнявіць Гусакова, што ён пайшоў на такі ганебны крок?

– Дакладна адказаць на ваша пытанне, зразумела, змог бы толькі сам Гусакоў. Я ж магу толькі выказаць на гэты конт некаторыя свае здагадкі. Праўда, мяркую, яны будуць недалёкія ад ісціны. Бо я ўжо даўно пільна назіраю за тым, як ён ставіцца да супрацоўнікаў, што воляй лёсу трапляюць да яго ў адміністрацыйную залежнасць.

Узяць хоць бы дырэктараў Інстытута сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі, а іх за дзевяць з гакам гадоў, якія мне апошнім часам давялося прапрацаваць у названым інстытуце, было тры. Дык вось ніводнаму з іх Гусакоў не дазваляў самастойна прымаць рашэнні нават па самых дробязных пытаннях. Як толькі перад імі паўставала тое ці іншае пытанне, яны былі абавязаны адразу ж ісці да Гусакова, каб атрымаць ад яго рашэнне, а затым старацца выконваць яго толькі так, як ім загадаў “шэф”. Любое адхіленне ад ягоных указанняў пагражала ім непазбежным строгім ушчуваннем. Гусакоў нават кантраляваў выказванні дырэктараў інстытута і жорстка папракаў іх, калі тыя дазвалялі сабе гаварыць і пісаць штосьці не так, як ён сам лічыў правільным. Па сутнасці, усіх іх ёнператварыў у звычайных паслухмяных марыянетак. Таму меў рацыю адзін з дырэктараў інстытута, калі казаў: “Я ўсяго толькі вартаўнік пры пасадзе дырэктара”.

Як чалавек, які нямала гадоў не збоку назіраў за тым, што робіцца ў Нацыянальнай акадэміі, я маю поўнае права выказаць такое меркаванне. Гэтак жа сама пільна сачыў і сочыць Гусакоў і за іншымі супрацоўнікамі інстытута, найперш вядучымі, фактычна абавязваючы іх строга прытрымлівацца ягоных поглядаў. Ці не гэта спрыяе таму, што ў інстытутах з’яўляюцца цэлыя “штаты” даносчыкаў?

Асабліва жорстка кантралюе Гусакоў атэстацыю навуковых кадраў. Любы саіскальнік навуковай ступені, які вырашыў абараніць сваю дысертацыйную працу на ягоным савеце, перш за ўсё павінен падаць яе для разгляду непасрэдна самому Гусакову. І пасля таго, як ён прыме па ёй станоўчае рашэнне, далейшае абмеркаванне дысертацыі ў інстытуце носіць чыста фармальны характар.

Так, кожны раз, адкрываючы пасяджэнне Навукова-метадычнага савета, на якое вынесена пытанне аб рэкамендацыі дысертацыі для яе публічнай абароны, старшыня савета паведамляе прысутным, што Уладзімір Рыгоравіч дэталёва азнаёміўся з дысертацыяй і палічыў яе цалкам вартай для разгляду на савеце па абароне дысертацый. Тым самым ён дае зразумець членам Навукова-метадычнага савета, што іх асноўная задача – ухваліць рашэнне, прынятае асабіста Гусаковым. Практычна аналагічная ўстаноўка давалася і членам савета па абароне дысертацый, у выніку чаго апошнія, можна сказаць, ператвараліся ў простых статыстаў, абавязаных пацвердзіць рашэнне Гусакова, аднаасобна прынятае ім на самым пачатку разгляду дысертацыйнай працы.

У сувязі з гэтым часам справа з атэстацыяй навуковых кадраў даходзіла да сапраўдных кур’ёзаў. Вось адзін з іх, удзельнікам якога мне давялося быць асабіста.

Неяк кіраўніцтвам інстытута мне было даручана выступіць у якасці эксперта па кандыдацкай дысертацыі, якая выносілася на публічную абарону. Як заўсёды, я ўважліва прачытаў дысертацыйную працу і зрабіў па ёй цэлы шэраг крытычных заўваг. Затым запрасіў да сябе яе аўтара, выказаў яму свае заўвагі і параіў іх выправіць, каб ён мог больш годна выглядаць на пасяджэнні савета пры абароне сваёй дысертацыі. Саіскальнік не аспрэчваў ніводнай з маіх заўваг, падзякаваў і пайшоў да сябе. Праз колькі хвілін ён вярнуўся да мяне са сваім навуковым кіраўніком, якая пачала ўпрошваць мяне не настойваць на ўнясенні ў дысертацыю яе падапечнага істотных паправак, якіх вымагаюць выказаныя мною заўвагі, паколькі, маўляў, іх можа прыкмеціць Уладзімір Рыгоравіч і зняць дысертацыю саіскальніка з абароны.

Сваімі крытычнымі заўвагамі і выступленнямі пры абмеркаванні на савеце кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, у тым ліку падрыхтаваных пад навуковым кіраўніцтвам Гусакова, я, безумоўна, моцна псаваў усю ягоную “абедню”, выклікаючы з яго боку да сябе цягам часу ўсё большае раздражненне. Асабліва моцна ўзлаваўся на мяне Гусакоў, калі мы з яшчэ адным членам савета, занятым на працы ў вышэйшай школе, на стадыі экспертнай ацэнкі “завалілі” доктарскую дысертацыю, падрыхтаваную пад ягоным навуковым кіраўніцтвам былым уплывовым чыноўнікам, які выпадкова апынуўся на высокай пасадзе ў акадэмічнай навуцы.

Па якісьці важкіх прычынах Гусакоў быў вельмі зацікаўлены ў забеспячэнні паспяховай абароны дадзенай дысертацыі, бо, як толькі даведаўся аб падрыхтаваных намі адмоўных водгуках, адразу ж патэлефанаваў кожнаму з нас па хатніх нумарах, патрабуючы памяняць нашы водгукі на дысертацыю з адмоўных на станоўчыя. Толькі мы не паддаліся на ягоныя ўгаворы: надта ж недасканалая была дысертацыйная праца. Акрамя ўсіх іншых недахопаў, па тэксце адчувалася, што яна напісана рознымі аўтарамі. Мой калега ў дадатак доказна абвінаваціў саіскальніка ў плагіяце, што ўвогуле недапушчальна.

Пасля таго як я вырашыў на пасяджэнні савета адкрыта выступіць супраць прысуджэння вучонай ступені доктара эканамічных навук чарговаму падапечнаму Гусакова, а праз некаторы час – задаць саіскальніцы такой жа ступені пытанне, у якім ставілася пад сумненне адна з яго прапаноў па далейшым развіцці аграрнай эканомікі, якую ён лічыў не іначай як найвялікшым уласным дасягненнем у галіне аграрнай эканамічнай думкі, цярпенне Гусакова канчаткова скончылася, і ён без прамаруджвання строга загадаў дырэктару інстытута вывесці мяне са складу савета па абароне дысертацый. Той, як гэта здаўна было заведзена ў Інстытуце сістэмных даследаванняў у АПК НАН Беларусі, без усялякіх хістанняў спраўна выканаў дадзенае даручэнне свайго “шэфа”, хоць дзеля гэтага яму давялося на адзін дзень вярнуцца з адпачынку.

Як мне стала вядома, моцнае раздражненне выклікала ў Гусакова таксама мая апошняя кніга “Перад лёсавызначальным выклікам”. У ёй я выклаў свае ўласныя меркаванні наконт усяго таго, што адбываецца апошнім часам у эканоміцы Беларусі і ва ўсіх астатніх сферах грамадскай жыццядзейнасці, якія прынцыпова разыходзяцца з меркаваннямі Гусакова. Відаць, усё гэта ў рэшце рэшт дапякло яго так, што ён вырашыў: пара гнаць Лыча на пенсію, каб ён сваімі кнігамі і артыкуламі не псаваў больш карціну квітнеючай Беларусі і ягонае аблічча непераўзыдзенага вучонага – эканаміста-аграрніка.

Ігар САМУСЕНКА.

(Працяг у наступным нумары.)

СУД

За хабар – 7 гадоў калоніі

У Брэсце ўчора абвясцілі прысуд былому дырэктару Пружанскага завода радыёдэталяў.

Кіраўнік прадпрыемства быў затрыманы з доказамі злачынства ў ліпені гэтага года ў Мінску, калі атрымаў незаконнае ўзнагароджанне ў памеры 1200 долараў ад заснавальніка камерцыйнай структуры за спрыяльнае вырашэнне пытанняў гаспадарчых узаемаадносін паміж дзвюма арганізацыямі. Падчас следства было ўстаноўлена, што дырэктар завода сістэматычна браў хабар ад прадстаўніка гэтай фірмы.

У выніку экс-дырэктару завода прызначылі пакаранне – 7 гадоў пазбаўлення волі з адбываннем у папраўчай калоніі ўзмоцненага рэжыму.

Віктар ШПАК.

РАСКЛАДЫ

Генерал Аляксандр Кавальчук узначаліць крымінальную міліцыю?

У Міністэрстве ўнутраных спраў вакантная пасада першага намесніка міністра-кіраўніка крымінальнай міліцыі. Не выключана, што яе зойме цяперашні начальнік УУС Мінаблвыканкама генерал-маёр Аляксандр Кавальчук.

«Народная Воля» прыгледзелася да яго біяграфіі.



Як вядома, былога начальніка крымінальнай міліцыі **Івана Падгурскага** пару тыдняў таму звольнілі са службы ў органах унутраных спраў у запас па ўзросце. Яму было 55 гадоў.

Генералу Аляксандру Кавальчуку 48 гадоў.

Ён нарадзіўся ў вёсцы Леткаўшчына Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Мінскае вышэйшае ваеннае каманднае вучылішча, Акадэмію МУС Рэспублікі Беларусь.

З афіцыйнай біяграфіі Кавальчука вядома, што ён меў дачыненне да крымінальнай міліцыі: быў начальнікам крымінальнай міліцыі Слуцкага і Бабруйскага гарвыканкамаў, а таксама Магілёўскага аблвыканкама, і пачынаў сваю міліцэйскую кар’еру оперупаўнаважаным аддзялення крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі.

З красавіка 2014-га па студзень 2018 года Кавальчук займаў пасаду начальніка УУС Магілёўскага аблвыканкама.

Начальнікам УУС Мінаблвыканкама Кавальчук працуе крыху больш за два гады.

Аляксандра Кавальчука, дарэчы, ужо не ўпершыню сватаюць у міністэрства. Некаторы час яго нават называлі канкурэнтам **Ігара Шуневіча.** Праўда, у адрозненне ад скандальна вядомага былога міністра Кавальчук прытрымліваецца даволі ліберальных поглядаў.

Вера ВІР.

ЗДАРЭННІ

Ад азарту – да трагедыі

У мінулую нядзелю выратавальнікам Веткаўскага раёна паведамілі пра мужчыну, які патануў у возеры ля вёскі Вясёлка. Цела 50-гадовага рыбака дасталі з палонкі ў 50 метрах ад берага пры дапамозе выратавальнай дошкі.

На працягу гадзіны аналагічны званок паступіў выратавальнікам з Лоеўскага раёна. Таксама 50-гадовы рыбак патануў у возеры недалёка ад вёскі Старая Лутава.

СТОП-КРАН

Прыехалі!

Учора ў Бабруйску спынілі сваю працу тры прадпрыемствы “Белшыны” – заводы масавых, буйнагабарытных і звышбуйнагабарытных шын.

У каментарыі “Коммерческому курьеру” работнікі прадпрыемства патлумачылі, што няма сыравіны. Персанал адпраўлены ў вымушаныя адпачынкі з захаваннем дзвюх трацей заробку.

Начальнік аддзела ідэалагічнай і сацыяльнай работы ААТ “Белшына” **Юрый Андрыеўскі** заявіў журналістам, што заводы масавых шын і буйнагабарытных павінны запусціцца 21 лютага, а завод звышбуйнагабарытных шын адновіць працу не раней за 1 сакавіка.

ЧУЛІ?

Пластыкавага посуду не будзе

Забарона на выкарыстанне аднаразовага пластыкавага посуду ў Беларусі ўступіць у сілу з 1 студзеня наступнага года.

Як паведаміў намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр Корбут, на першапачатковым этапе выключаць пластыкавыя шклянкі, талеркі, палачкі для размешвання напіткаў і кантэйнеры для захоўвання ежы.

Паводле яго слоў, некаторыя прадпрыемствы канцэрна «Беллеспаперпрам» цалкам гатовы да выпуску папяровых пакетаў, якія заменяць пластык.

ОСТРЫЙ ВЗГЛЯД



Василий ШЛЫНДИКОВ – председатель комиссии по экономической политике и реформам Верховного Совета Республики Беларусь 13-го созыва, член Объединенной гражданской партии. Автор многочисленных публикаций в «Народной Воле». Вот уже несколько лет он внимательно следит за событиями в соседней Украине. Сегодняшнее его интервью, не исключаем, может быть воспринято читателями неоднозначно. Кто-то, возможно, через иную призму смотрит на то, что происходит в этой небезразличной для нас стране. Что ж, страницы «Народной Воли» – для разных точек зрения.

Демократия по-украински

– Василий Михайлович, выступая раньше на страницах «Народной Воли», вы, помнится, высоко оценивали деятельность тогдашнего президента Украины Петра Порошенко. Так почему же он проиграл выборы?

– Потому и проиграл, что много сделал для Украины и украинцев. Но при этом, естественно, затронул интересы тех, кто годами паразитировал на украинском государстве, раскрадывая бюджет страны. Этим он вызвал недовольство отечественных олигархов, которые свое состояние приумножали за счет собственного политического влияния. Один из них – Игорь Коломойский, почти целиком приватизировавший пол-Украины, – вынужден был скрываться в Израиле.

Украинского президента, я считаю, выбирает не народ, а группа богатейших людей Украины, которым принадлежат основные телевизионные каналы. Эти деятели поняли угрозу для своего бизнеса и решили заменить президента, организовав травлю Порошенко на своих телеканалах. Они сделали ставку на Юлию Тимошенко, бабушку украинской коррупции, надеясь опять присосаться к бюджетному пирогу. Существенную помощь в этом им оказывало российское телевидение, их фабрики троллей. Но неожиданно Тимошенко проиграла и не вышла во второй тур. Соперником Порошенко оказался актер Владимир Зеленский. Его команда продолжила клеветническую аморальную пропаганду против Порошенко. В результате вот такой пропагандистской вакханалии Зеленский избирается президентом Украины.

Чего только не говорили про Порошенко: и брата убил, и стал богаче в 100 раз, и власть хочет незаконно захватить, сфальсифицировав выборы. Но оказалось, что за время президентства его состояние, по оценке Forbes, уменьшилось на 40 процентов (с 1,3 миллиарда долларов США в 2014 году до 750 миллионов в 2019-м). Не стал он организовывать себе и «элегантную» победу на выборах. За него проголосовала четверть наиболее образованной и состоятельной части электората. Впервые в истории Украины тысячи людей в последний рабочий день Порошенко на посту президента пришли под здание администрации и благодарили Петра Алексеевича за работу.

– С чего начал Зеленский, став президентом Украины?

– Начал он с желания как можно быстрее осчастливить украинцев, требовал ускорить подсчет голосов и передачу ему президентской булавы. В день инаугурации он заявил о роспуске Верховной Рады, предложил членам правительства написать заявления об уходе в отставку. В этот день он уже, как мне показалось, убедительно играл Наполеона Бонапарта перед битвой под Бородино, а не президента Голобородько из сериала «Слуга народа», благодаря которому он и стал президентом. Решительный такой, всезнающий, убедительный в своей правоте. Хотя, думается, ничего он не знал ни о государстве, ни о политике, ни об управлении этим государством.

Раду он, вопреки Конституции, распустил. Но Конституционный суд все же признал это решение конституционным, хотя многие ведущие юристы так не считали. Заявил, что нужно предшественников люстрировать. Правда, западные партнеры ему объяснили, что предшественники спасли Украину от распада и полного захвата Россией, провели реформы, которые позволили восстановить экономику страны. Предложений по люстрации больше не было, но он ездил по стране, делал разносы и снимал с должностей региональных чиновников. Электорат, как и у нас уже четверть века, был в восторге. По Конституции Украины, после выборов президента меняются главы областных и районных администраций. Никому из них не сказали спасибо за их работу, наоборот. Такое отношение не добавило Зеленскому сторонников. А желающих показать, чего он стоит, становилось все больше. А это – тысячи образованных и опытных людей. В общем, первые месяцы он активно наживал себе врагов.

– Но, заметим, при этом его партия «Слуга народа» получила большинство в Верховной Раде.

– Да, это так. Большинство старой элиты в Раду избрано не было. Три четверти парламента обновилось. Победили многие люди без должного образования, фактически безработные: свадебный фотограф, спортсмены, рестораторы, а также 10 журналистов, большая часть которых – сотрудники телеканала «1+1» того самого Коломойского, которые раскручивали рейтинг Зеленского перед выборами. Еще пять человек со студии «Квартал-95», совладельцем которой является сам Зеленский. В итоге из фракции в 254 человека только около 50 разрешили участвовать в телепередачах, и то отдельным из них лучше бы этого не делать. Польза от большинства только одна –по команде давить на кнопки. Кадры еще те, почти каждую неделю в Раде скандалы. Председатель комитета заказывает по телефону проституток, другой депутат обсуждает коррупционную схему, третий сидел за изнасилование и представил поддельные дипломы об образовании, четвертый за счет государства оплачивал свое проживание у собственной тещи и т.д. и т.п.

– Так скажите, пожалуйста, что собой представляет команда Зеленского, на которую он опирается в своей работе?

– Если говорить о команде, то она вначале вообще состояла лишь из четырех человек: Д.Разумкова, спикера Верховной Рады Украины; А.Богдана, главы офиса президента, бывшего юриста олигарха Коломойского (уже ушел в отставку); И.Баканова, руководителя СБУ; Р.Рябошапки, генерального прокурора. Все остальные люди из окружения Зеленского по его предыдущему месту работы. Они обслуживающий персонал, а не политики, и среди них много сторонников «русского мира». Немало сторонников этого «мира» и во фракции Зеленского в Верховной Раде.

В правительстве подобраны молодые подготовленные люди (правда, без опыта госуправления). Премьер Алексей Гончарук – самый молодой премьер в истории Украины. Ему нынче будет 36 лет. Мне представляется, что состав правительства – удачный выбор, особенно по сравнению со старыми кадрами (крепкими хозяйственниками, предлагающими себя в премьеры). На своем месте спикер Верховной Рады Дмитрий Разумков. Он молод, но уже сформировавшийся политик: умен и неконфликтен.

Сегодня Зеленский подвергается критике со всех сторон. Поводы для критики создают его некомпетентные помощники и он сам. Пока, на мой взгляд, он не стал настоящим президентом. Но больше всего шельмуется правительство, которое, как я понимаю, перекрыло олигархам доступ к государственному пирогу. Поэтому и делается все, чтобы дискредитировать правительство и привести в него своих людей. Рейтинг Зеленского падает, правда, пока незначительно.

– Видимо, авторитет президента напрямую будет зависеть от развития экономики Украины?

– Надо сказать, что Зеленский получил страну в неплохом состоянии. Благодаря системным преобразованиям, начатым при Порошенко, рост экономики в 2019 году составил около 3,3 процента по сравнению со среднемировым уровнем в 2,5 процента. Госдолг Украины уменьшился до 52 процентов от ВВП по сравнению с 80 процентами в 2016 году. Начиная с 2015 года снижается количество безработных. За год Украина поднялась с 71-го на 64-е место в рейтинге Doing-Business-2020, а за пять лет в рейтинге Украина поднялась на 48 позиций. Доходы населения в валютном эквиваленте только за два года выросли на 60 процентов, средняя зарплата подскочила за 2019 год на 16 процентов и в минувшем декабре составила 519 долларов США (при рыночной цене на газ и нефтепродукты). Реальная зарплата украинцев превысила докризисные доходы более чем на 20 процентов. Минимальная зарплата составляет 191 доллар США, а это выше, чем в России и Беларуси.

Увеличились до семилетнего максимума валютные резервы, которые составили 25,3 миллиарда долларов США. Инфляция в 2019 году составила 4,1 процента. Надо сказать, что доходы населения выше статистических, так как уровень теневой экономики составляет около 50 процентов от ВВП.

Благодаря П.Порошенко, А.Яценюку, В.Гройсману в Украине сейчас экономическая стабильность, растут доходы населения, существует оснащенная армия, которая успешно противостоит российской агрессии. И все это в условиях шестилетней войны с Россией и потери российского рынка.

– Поскольку вы, Василий Михайлович, внимательно отслеживаете события в Украине, то скажите: что конкретно делается правительством и парламентом этой соседней страны, чтобы закрепить и приумножить успех в экономике?

– В турборежиме (как говорят в Украине) приняты десятки законопроектов, направленных на совершенствование рыночных отношений. Почти за половину из них проголосовали депутаты из «Европейской солидарности» Петра Порошенко. Как это повлияет на экономику страны – увидим. В Верховной Раде рассматривается законопроект о рынке земли. Правительство продолжает реформы, начатые предыдущей властью.

Не ясна пока судьба медицинской реформы. Новый министр здравоохранения Зоряна Скалецкая, красивая молодая женщина, умудрилась рассориться с коллективом аппарата министерства. В результате в знак несогласия с действиями министра уволились многие реформаторы. Правда, премьер обещает, что реформа будет продолжена.

– Тогда за что Зеленский так, мягко говоря, не любит Порошенко?

– Да, действительно, еще во время предвыборных теледебатов Зеленский сказал, что из-за Порошенко потеряно пять лет. Возможно, он имел в виду себя. Хотелось, видимо, заработать больше миллионов. Хотя чем ему мог помешать президент, не ясно. Ну и, конечно, он имел в виду своего друга и партнера – олигарха Коломойского, которого Порошенко отодвинул от государственной кормушки. После вывода из крупнейшего в Украине «Приватбанка» (принадлежавшего Коломойскому и партнерам) 5 миллиардов долларов, последний, опасаясь тюрьмы, скрывался в Израиле. Государство вынуждено было национализировать и докапитализировать банк суммой в 5 миллиардов долларов во избежание его банкротства и кризиса экономики страны. Конечно же, действия Порошенко были восприняты в штыки. Коломойский после победы Зеленского возвратился в Украину и начал требовать возврата банка. Украинские суды он с легкостью выигрывает.

Согласитесь, оценить работу предшественников Зеленский сам не может. Он по образованию юрист, хотя ни дня по специальности не работал. Делать какой-то анализ экономического состояния страны, видеть перспективы развития государства тоже не в состоянии. У него нет элементарных знаний для этого. Отсюда у него, полагаю, и такая реакция на Порошенко. Хотя, не исключено, он опасается, что Порошенко может избраться повторно на пост президента Украины, у него растет рейтинг. Неслучайно российское телевидение активно продолжает клеветническую кампанию против Петра Алексеевича.

– При Порошенко были созданы независимые антикоррупционные органы. Такие как НАБУ, антикоррупционная прокуратура, Государственное бюро расследований, антикоррупционный суд, руководители которых избирались конкурсными комиссиями. Существует судейское самоуправление. Насколько эффективно они работают, как они проявили себя при смене власти?

– Пока эффективность работы этих органов невысокая. Как показала практика, конкурсные комиссии выбирали не самых подготовленных для такой работы людей. А в случае с Государственным бюро расследования произошел полный провал. Чтобы сохранить место, руководитель этого ведомства Роман Труба начал выполнять указания из офиса президента по уголовному преследованию Порошенко и других чиновников. Против пятого президента начали открывать уголовные дела по надуманным признакам. Была обнародована прослушка разговора Р.Трубы с руководителем офиса президента А.Богданом, когда последний давал указания по преследованию Порошенко, а директор ГБР уверял, что все сделает.

– Не, я нічога пра яе не ведаў. І пабачыў тую кнігу толькі тады, калі паехаў у Нью-Ёрк на сесію ААН. Мне яе перадаў нехта з беларускіх эмігрантаў, з якімі мы, прадстаўнікі БССР, сустракаліся. Помню, неасцярожна паклаў кнігу на стол у пакоі, дзе жыла наша дэлегацыя, ёю зацікавіўся тагачасны міністр замежных спраў БССР Анатоль Гурыновіч. Пагартаў і параіў схаваць.

– **А ці заўважылі гэткую відавочную ідэалагічную дыверсію на радзіме?**

– Дыверсія была заўважана ў ЦК КПБ, але справа абмежавалася тым, што падчас размовы там мяне проста крыху паўшчувалі, сказалі, што я напісаў не вельмі вытрыманую ў ідэйных адносінах паэму. Неяк абышлося. Пэўна, адыграў сваю ролю і той факт, што паэма раней друкавалася ў часопісе «Полымя». Да таго ж, як мне падаецца, тагачасная савецкая ўлада не была помслівай і ў дробязях нецярпімай.

«Стральцоўскую прэмію трэба даваць маладым»

– **Тое, што вы сталі лаўрэатам Стральцоўскай прэміі, для многіх стала неспадзяванкай. І мне прыгадаўся факт з гісторыі літаратуры. Калі ў свой час Уладзіміру Караткевічу далі прэмію Івана Мележа, ён ледзь не пакрыўдзіўся: маўляў, я не горш за Мележа пішу. А вы, атрымліваючы Стральцоўскую прэмію, не перажылі падобных эмоцый?**

– Не, мерацца талентам са Стральцовым у мяне памкненняў дакладна не было (*усміхаецца*). Я ўдзячны журы за такое рашэнне, але лічу, што гэту прэмію трэба даваць маладым.

– **Неяк, трапіўшы на Лепельшчыну, я заехаў у вашу родную вёску Дзямешкава. Там мне адразу паказалі хату Вярцінскіх. Мяне ўразілі яе памеры – як гарадская аднапакаёўка. Вашай сям'і там не цесна было?**

– Як гэта ні дзіўна, было не цесна, а ўтульна. Я заўсёды прыгадваю родную хату, калі мы ў стольным Мінску гаварылі пра метражы жыллёвай плошчы – колькі ў каго. У Дзямешкаве жылі без электрычнасці, я памятаю нават вечары пры лучыне. Я быў старэйшым у сям'і, і падчас вайны мы з малодшым братам Валодзем ездзілі па дровы – часам у зімовую завіруху. Прывозілі, пілавалі... Мне вельмі шкада, што наша хата сёння пустуе. Думка пра пустую хату з'яўляецца свайго роду ілюстрацыяй да гучных слоў пра адраджэнне нашага сяла, пра росквіт аграгарадкоў. Мая вёска (як і сотні іншых), па сутнасці, вымірае. Дарэчы, я там пабываў на мінулым тыдні, наведаў магілы сваіх бацькоў, але не сустрэў ніводнага дзямешкаўца. Дзве бабулі і адна маладзіца – вось і ўсе жыхары.



3 маладымі чытачкамі ў родным Лепелі.

– **За сваё жыццё вы займалі розныя пасады – былі сакратаром Саюза пісьменнікаў, рэдагавалі тыднёвік «Літаратура і мастацтва», працавалі ў Вярхоўным Савеце. Дзе вы адчувалі сябе найлепш, як кажуць, у сваёй талерцы?**

– Відаць, усё ж у рэдакцыі «ЛіМа». Бо і па сённяшні дзень жыве ўва мне патрэба публічна выказвацца на тую ці іншую надзённую тэму. І не толькі ў вершах. Таму найкамфортней мне было ў журналістыцы. Я ж і ў Вярхоўны Савет пайшоў з пасады галоўнага рэдактара «ЛіМа». Праўда, не заўсёды спалучэнне газетнай працы з літаратурнай бывае плённым. Я разумею, што калі б менш часу і энергіі аддаваў газеце, то нашмат больш зрабіў бы як паэт, як драматург. Але мяне заўсёды суцяшала тое, што ў гісторыі найноўшай беларускай літаратуры нямала падобных прыкладаў. Янка Купала рэдагаваў «Нашу Ніву». А потым пайшло-паехала – усе нашы класікі працавалі ў рэдакцыях.

«Паэт у Беларусі павінен быць змагаром»

– **У «ЛіМе» быў усё ж творчы асяродак. А дэпутацтва ў Вярхоўным Савеце не перашкаджала быць паэтам?**

– У сэнсе страты часу і энергіі, мабыць, усё ж перашкаджала. Згадаем прызнанне рускага класіка: «Мне борьба мешала быть поэтом, / Песня мне мешала быть бойцом». Але я пра гады, праведзеныя ў Вярхоўным Савеце, не шкадую. І не толькі таму, што на ўсё воля Божая. Усё ў нашым жыцці адначасна і перашкаджае, і спрыяе адно аднаму. І потым – хіба ўдзел у падрыхтоўцы і прыняцці Дэкларацыі аб суверэнітэце Беларусі і новай дэмакратычнай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь былі не варты таго, каб ахвяраваць адным-двума зборнікамі вершаў?!

– **Яшчэ як варты, гэта бясспрэчна. На нядаўняй кніжнай выставе трапіўся мне на вочы Каран. Я разгарнуў яго і прачытаў: «Паэты – хлусы, якія блукаюць па раўнінах і гавораць тое, чаго самі не робяць». Ну, так, мабыць, лічаць прававерныя мусульмане. Вядома і другая формула: «Поэт в России больше, чем поэт». А кім мае быць паэт у Беларусі?**

– А ў Беларусі паэт – з'ява яшчэ большая, чым паэт у Расіі. Для аўтара згаданага табой выслоўя, Яўгенія Еўтушэнкі, не існавала праблемы мовы, праблемы гістарычнай памяці, праблемы палітычнай незалежнасці яго краіны. А перад беларускім паэтам усе гэтыя праблемы рэальна паўстаюць. Таму ён, апрача ўсяго, павінен быць патрыётам і змагаром за Беларусь. У якой, нягледзячы на ўсе выпрабаванні, я ўпэўнены, шчаслівая будучыня. Як сказана ў адным з маіх вершаў: «*Ешчэ Польска не згінэла, / шчэ нэ вмэрла Украіна, / і жыве на свеце белым / Беларусь, мая краіна... / Будуць воля ды Пагоня, / ды паходні палаць ясна, – / І не згінем мы сягоння, / ну а заўтра – жыцьмем шчасна*».

– **А калі ўпершыню ў беларускай гісторыі верш загучаў як палітычная пракламацыя? Можа, з вуснаў Кастуся Каліноўскага?**

– Так, Каліноўскі заклікаў (менавіта ў вершы) «за праўду станавіцца смела». Беларускі верш разам з Каліноўскім пайшоў на эшафот. Беларускі верш здавалі ў рэкруты разам з Паўлюком Багрымам. Беларускі верш разам з Алесем Гаруном судзілі і высылалі ў Сібір. Беларускі верш пры царскай уладзе садзілі ў астрог, а пры бальшавіцкай – ставілі да сценкі тварам з узнятымі рукамі разам з Якубам Коласам. Беларускі верш выклікалі на допыты, даводзілі да спробы самагубства разам з Янкам Купалам. Беларускі верш, надрукаваны і яшчэ толькі задуманы, не зусім вынашаны ў сэрцах і розумах яго носьбітаў, везлі на расстрэл у Курапаты. Яго ў рукапісным выглядзе палілі на вялікім вогнішчы ў мінскай турме-«амерыканцы». Так, беларускі верш зведаў і «амерыканку», і «валадарку», і этапы, і канвой, і зону, і калючы дрот ГУЛАГа. Беларускі верш рэпрэсуюць і ў нашы дні, пры сённяшняй уладзе, якая судзіць паэтаў за выступленні на плошчы ў абарону незалежнасці.

– **Лаўрэат Стральцоўскай прэміі атрымлівае – як яшчэ адну ўзнагароду – сваю новую кнігу. Выйшла яна і ў вас – пад назвай «Тым часам». У ёй я з задавальненнем перачытаў верш «Размова з Ду Фу»: *«Чаму, Ду Фу, пакутуе народ? / А хіба можа быць наадварот, / калі яго правіцелі – тыраны, / як барсы, жорсткія, тупыя, як бараны»*. Як вам удавалася друкаваць такое ў 1969 годзе?**

– Якраз таму, што верш імітаваў дыялог з кітайскім паэтам Ду Фу, які жыў 400 гадоў таму. Там я літаральна працытаваў ягоныя радкі. Памятаю, рэдактар у выдавецтве зачапіўся якраз за страфу, якую ты працытаваў. Ён насцярожыўся. А я прынёс яму томік Ду Фу і паказаў, што радкі пра правіцеляў-тыранаў напісаны даўно. І рэдактар супакоіўся.

«Мне вельмі не хапае равеснікаў»

– **У Беларусі існуе яшчэ і гэткая праблема: пісьменнік і яго малая радзіма. Я ведаю, што ўшацкія ўлады насцярожана ставіліся да Рыгора Барадуліна, лагойскія – да Ніла Гілевіча… А як адносяцца да вас у вашым родным Лепелі?**

– Тут шмат што залежыць ад канкрэтных людзей. З загадчыкамі раённых аддзелаў культуры можна было паразумецца. Пакуль не з'явіліся намеснікі старшынь райвыканкамаў па ідэалогіі. Гэтыя ідэолагі мясцовага маштабу лічаць сваім абавязкам, сваёй крэўнай справай быць пільнымі, сачыць за ўсімі падзеямі ў раёне. Але не буду скардзіцца, у мяне нармальныя адносіны і з загадчыкам аддзела культуры Лепельскага райвыканкама, і з дырэктарам раённага Дома культуры, і з кіраўніцтвам раённай бібліятэкі, і з дырэктарамі Каменскай і Матырынскай школ, дзе я вучыўся. Само жыццё мацнейшае за ўсіх цэнзараў і ідэалагічных чыноўнікаў.

– **Вы чалавек яшчэ даваенны. Ці ўдаецца знаходзіць паразуменне з маладзейшымі пакаленнямі?**

– Успамінаю, як Максім Лужанін, які сваё 90-годдзе адзначыў вялікай творчай вечарынай, прызнаваўся мне, што няма каму патэлефанаваць і пагаварыць-паўспамінаць – усе сябры ўжо сышлі ў лепшы свет. Прызнацца, мне таксама вельмі не хапае равеснікаў. Хоць і тут грэх скардзіцца – заходзяць і тэлефануюць малодшыя сябры, сустракаемся на розных імпрэзах. Асабліва не хапае мне Ніла Гілевіча, з якім мы блізка сябравалі, я цаніў яго не толькі як паэта, але і як выдатнага мовазнаўцу. Самота мая пабольшала, калі пазалетась адышла ў лепшы свет мая жонка Ада Сямёнаўна, з якой мы пражылі разам 57 гадоў. Дарэчы, днямі напісаліся прысвечаныя ёй радкі: «*Усё пра яе нагадвае мне… / Сонца ранішняе ў акне. / Воблака белае ў сіняве. / Песня птушыная ў лісцве. / Усё, што жыве, існуе, слыве, / Усё пра яе нагадвае мне. / Наяве і ў сне*».

– **Вы далёка не рэкардсмен па колькасці выдадзеных кніг. А ці былі часы, калі вам зусім не пісалася?**

– Такіх перыядаў было больш, чым трэба. Часам гадамі я не мог заставацца са сваёй паэтычнай музай сам-насам, пераключаўся на публіцыстыку, грамадскую дзейнасць. Асабліва «маўклівыя» на паэзію гады майго рэдактарства ў «ЛіМе» (я там пачаў працаваць летам 1986-га). У разгар перабудовы даводзілася перабудоўвацца самім, перабудоўваць сваіх чытачоў і спрабаваць перабудаваць жыццё ўсёй Беларусі на новы лад. І тады было не да вершаў.

– **А як вам бачацца беларуска-расійскія адносіны, напружаныя апошнім часам, сітуацыя ў Расіі, з якой мы знаходзімся ў адной палітычнай і інфармацыйнай прасторы?**

– На душы трывожна, асабліва калі мець на ўвазе той факт, што Расія – не проста наша ўсходняя суседка, а што мы з'яўляемся часткай гэтак званай саюзнай дзяржавы. З Масквы мы ўжо не раз чулі – пад сумнеў ставіцца незалежнасць колішніх савецкіх рэспублік... А паглядзіце, што ўяўляюць з сябе расійскія СМІ, найперш федэральныя тэлеканалы. Яны мяне штодня бянтэжаць і палохаюць. Як уключыш – там усё пра веліч і сілу Расіі. І сам Пуцін ужо не гаворыць пра шчаслівую, заможную ці сацыяльна скіраваную дзяржаву – толькі пра веліч і сілу. Але ж, як вядома, Бог не ў сіле, а ў праўдзе. А праўда на нашым баку.

ЭШЕЛОНЫ ВЛАСТИ

Павел Легкий снова уезжает в Москву?

Не исключено, что в ближайшее время в Министерстве информации произойдут кадровые перестановки. Первый заместитель министра Павел Легкий получил предложение о новой работе в Москве – в Евразийской экономической комиссии.



Павла Легкого хотел бы видеть в своей команде председатель коллегии Евразийской экономической комиссии Михаил Мясникович.

«*Прежнее место работы советником-посланником в посольстве Беларуси в России, говорят, Павел Николаевич покидал с тяжелым сердцем*, – одним из первых сообщил о возможных кадровых перестановках телеграм-канал «Папаратор». – *После руководства пресс-службой президента дипломатическая синекура для него стала периодом заслуженного отдохновения. Да и жалование в дипмиссии было несравнимо весомее, чем при любой чиновничьей должности на родине. В том числе и в министерских высотах.*

Не исключено, что и на этот раз денежное довольствие окажется на уровне. Однако есть риск, что характер должностных обязанностей будет не в пример напряженней, чем советовать да посылать…»

Назначение заместителем министра информации стало для Павла Легкого некоторой неожиданностью. Об этом он сам два года назад говорил «Народной Воле»: «*Безусловно, я знал о том, что этот вопрос прорабатывается, но не ожидал, что соответствующее решение будет принято так скоро*».

С предстоящим назначением все пока как раз наоборот. Разговоры о командировании Павла Легкого в Москву идут уже не первый месяц, но вопрос пока не решен окончательно.

Готовится ли сам Легкий к переезду в Москву?

«*Одно дело собираться, а другое – отпустят ли*», – говорит он.

ИЗ ЛИЧНОГО ДЕЛА

В 1993 году Павел Легкий закончил Минское высшее военное командное училище. Служил в Вооруженных силах, занимался также военной наукой в Военной академии. С 1998 года работал в журнале «Армия» сначала корреспондентом, затем редактором отдела. В 2002 году стал журналистом телеканала ОНТ. Вскоре после этого попал в президентский пул, а в мае 2003 года возглавил пресс-службу президента.

В 2013 году Легкий покинул пост главы президентской пресс-службы. Свой уход он прокомментировал так: «Мне действительно жаль прежней работы: с президентом работать очень ответственно, но и очень интересно. Жаль расставаться с людьми, с которыми вместе работал. Но лично для меня как для чиновника пришло время сменить сферу деятельности».

Марина ВИШНЕВСКАЯ.

РЭГІЁН

Новы гандлёва-забаўляльны комплекс – больш за 7 тысяч наведвальнікаў за гадзіну

У Гродне пачаў дзейнічаць у тэставым рэжыме новы гандлёва-забаўляльны комплекс Triniti, адзін з самых буйных у Беларусі.

Агульны кошт праекта для ААТ "Трыніці Інвест", даччынай кампаніі "Контэ СПА", перавысіў 100 мільёнаў еўра. Работа распачалася толькі на 35% плошчаў ГЗК. Калі запрацуюць астатнія 65%, менеджары праекта пакуль сказаць не могуць.

За першыя 10 хвілін работы Triniti наведалі 1800 чалавек, за першую гадзіну– 7650. І ўсё гэта ў звычайны будны дзень.

Аляксей МІХАЛЁЎ.

ГДЕ ЖЕ ВЫ ТЕПЕРЬ?

Виктор ПЛОСКИНА: «Без работы был полгода…»

До 1 июня этого года в Национальном академическом Большом театре оперы и балета должен появиться новый главный дирижер. Сегодня на эту должность претендуют несколько десятков человек.

Кресло главного дирижера освободилось весной минувшего года, когда ушел Виктор Плоскина.



«Маэстро Виктор Плоскина покинул пост главного дирижера Большого театра Беларуси в связи с возвращением в Киев и продолжением творческой деятельности в Украине, – сообщила тогда пресс-служба Большого театра. – *Виктор Плоскина продолжит сотрудничество с Большим театром Беларуси в качестве главного приглашенного дирижера. В связи с этим Большой театр Беларуси объявляет конкурс на замещение вакантной должности главного дирижера».*

Известно, что кандидат на замещение должности главного дирижера Большого театра Беларуси будет избран конкурсной комиссией путем тайного голосования до 1 мая 2020 года. Гендиректор Большого театра **Александр Петрович** должен утвердить решение конкурсной комиссии до июня этого года. «*По решению руководства театра избранному кандидату также может быть присвоен статус музыкального руководителя*», – говорится в Положении о конкурсе на замещение должности главного дирижера.

Чем сегодня занимается бывший главный дирижер белорусского Большого?

Виктор Плоскина – главный дирижер Киевского муниципального академического театра оперы и балета для детей и юношества. Он говорит, что не забывает Беларусь. И с интересом следит за тем, что происходит в театре.

– Виктор Михайлович, вы счастливы?

– Нет большего счастья, чем молодость! – *улыбается Плоскина.* – Я был счастлив, когда был молодым...

– После ухода из минского театра вы сразу нашли новую работу?

– Я примерно полгода был без работы. На нынешнюю должность прошел по конкурсу. В Украине сейчас всюду конкурсы! Это хорошая возможность получить должность, если ты действительно профессионал своего дела. Есть возможность проявить себя и получить работу. Но, с другой стороны, я все-таки считаю, что известных дирижеров нужно приглашать вне конкурса…

Марина КОКТЫШ.

РЭДКІЯ ЛЮДЗІ

Яго гадзіннікі!

Жыхар Дзяржынска **Андрэй Мартынюк** – унікальны майстар народных промыслаў. Больш за 30 гадоў ён вырабляе гадзіннікі і іншыя механізмы… з дрэва. У ягонай калекцыі гадзіннікі, прысвечаныя рок-музыцы: гуртам "Пінк Флойд", "Металіка", "Бітлз", а таксама серыя гадзіннікаў, выкананых па ўзорах беларускай выцінанкі. Ёсць гадзіннікі, выробленыя паводле мультфільма "Будзьма беларусамі!", афармленне якіх звязана з тэмай беларускай вёскі.

Самая маштабная кампазіцыя ў калекцыі майстра – драўляны механічны тэатр "Балабуха", які выконвае чатыры дзеі: "Каляды", "Купалле", "Дажынкі" і "Пілігрымы".

Механізмы майстар вырабляе з розных гатункаў драўніны, а працуюць гадзіннікі і іншыя механізмы без электрычнасці ці батарэек.



Андрэй Мартынюк каля драўлянага механічнага тэатра "Балабуха".

Ураджэнец Казахстана Андрэй Мартынюк даўно жыве ў Беларусі і з вялікай пашанай ставіцца да беларускай народнай культуры і нацыянальных традыцый. За гады творчасці майстар вырабіў больш за дзве сотні драўляных гадзіннікаў – уручную і на самаробным станку. Для большай хуткасці зараз выкарыстоўвае таксама лазерную рэзку і станок з праграмным кіраваннем.

Мастацкія творы Андрэя Мартынюка вядомы ў Польшчы, Расіі, Германіі, Італіі, Францыі, Аўстраліі.

Галіна АБАКУНЧЫК.

ЗНАЙ НАШИХ!

Анна Гуськова вернулась

Олимпийская чемпионка по фристайлу снова радует болельщиков победами. Сейчас она выиграла этап Кубка мира, который проходил в Москве.

Когда на Олимпиаде-2018 в корейском Пхёнчхане белорусская фристайлистка **Анна Гуськова** выиграла золотую медаль, это было маленькой сенсацией. Но уже в следующем году тренеры и сама спортсменка решили, что организму нужен отдых, а телу – небольшой «ремонт». Давали знать о себе старые травмы, поэтому прошлый сезон Анна пропустила.

«*Перед Играми-2014 тоже было очень тяжело,* – рассказала «Народной Воле» фристайлистка. – *Когда тебе первый раз разрезают колено, ты не понимаешь, что происходит. Костыли, около девяти месяцев простоя. На одну ногу нельзя было ступать, затем нужно было ее каждый раз сгибать под определенным градусом.*



Мама сильно переживала, для нее это тоже был шок. Одно дело, когда ты ей медали показываешь, и совсем другое – травмированную ногу.

Хотя ко всему привыкаешь. Перед следующей Олимпиадой начались проблемы с мениском, но это уже так, мелкие хлопоты. Как обычная жизнь любого спортсмена».

Анна добавляет, что, когда долго тренируешься и появляются первые успехи, отступать как-то уже и не хочется.

«*Хотя, не скрою, наш спорт не самый безопасный,* – отмечает моя собеседница. – *У меня иногда знакомые спрашивают: «Ты хоть понимаешь, что когда-нибудь неудачно приземлишься и развалишься на мелкие кусочки?" Но я люблю то, что делаю. Да и нет, наверное, такого вида спорта, где спортсмен был бы застрахован от травм. Спросите об этом у тех же фигуристок или «художниц», они вам расскажут много интересного.*

Да и статус олимпийского чемпиона – это все-таки уровень. Понимаешь, чего от тебя требуют. Но у меня после Игр появилось еще большее желание тренироваться. Знаете, чего спортсмен больше всего боится? Потратить десятки лет на тренировки и не попасть на олимпийский пьедестал. А золото – это вообще предел мечтаний. Так что после Пхёнчхана я стала увереннее».

Главный тренер сборной Беларуси по фристайлу **Николай Козеко** тоже рад, что Анна Гуськова вернулась в большой спорт.

«*Аня набирает форму,* – отмечает тренер. – *Собственно говоря, это ее первый удачный старт после Олимпиады. Она очень спокойно входила в форму…*»

Алесь СВЕТЛАНИЧ.

ПЕЧАЛЬНАЯ ИСТОРИЯ

Сын-захватчик, или Наследство и святая материнская любовь

Когда вы захотите сделать своим детям при жизни дарственную на недвижимость, в которой сами в данный момент проживаете, остановитесь и вспомните: ни одно доброе дело не остается безнаказанным. Поймите, это не изящная игра ума, а печальный опыт многих поколений. Подумайте, взвесьте: выдержат ли ваши наследники этот, возможно, невыносимый для них груз вашего благородства и великодушия? Вы уверены? Перечитайте, в конце концов, трагедию Шекспира «Король Лир», гениальное произведение литературы. Это художественный вымысел, да. Но сюжет во всем мире до сих пор разбивает сердца. Вот и в Минске сейчас разыгрывается драма, настоящий «Король Лир». Только действующие лица не отец и три дочери, а мать и один-единственный сын: можно сказать, история про королеву-мать и ее наследника. Королеву, которой, возможно, предстоит сейчас один путь – в странноприимный дом. А если по-простому, то в богадельню.

Бывает ли старость красивой? Несомненно. Тем более если вспомнить, что к пожилым годам человек чаще всего имеет то лицо, которое заслуживает. Я любуюсь **Ирмой Анатольевной Жарковой**: в преклонных годах она имеет внешность, полную достоинства и света. Плюс королевскую осанку. Человек строгой дисциплины, она и в 79 лет делает зарядку на тренажерах. Но это лишь маленький штришок к ее характеру. Главное – она всегда была профессионалом высочайшего класса, работала переводчиком во многих зарубежных компаниях в Минске и за границей, знакома с известными людьми нашей страны (и не только нашей). Конечно, богатства ей это не принесло, но честным трудом она смогла самостоятельно заработать кое-какие средства и перестроить маленькую советскую дачу «пять на шесть» в Ждановичах, оставшуюся от родителей, в небольшой трехкомнатный домик. Провела отопление, водопровод и со временем переехала туда с мужем на постоянное жительство. Теперь это ее место прописки. А свою трехкомнатную «сталинку» в центре столицы подарила сыну.



Но сыну нужно еще и ее загородное жилье! А как же! В престижных Ждановичах, под боком у президента, участок стоит сейчас баснословные деньги. А если на земле есть еще и строение… Хотя, конечно, рядом с коттеджами нашей «элиты» домик Ирмы Анатольевны – это заячья лубяная избушка. Но даже на нее, оказывается, нашлась лиса, готовая все отнять. Вернее лис – родной человек. Сыночек.

Считается, что отношения матери и сына – особенные, необъяснимые. Что любовь между ними чуть ли не иконная, образцовая, верная. Со стороны матери – верно. Для Ирмы Анатольевны сын даже теперь, в разгар этого чудовищного, некрасивого конфликта, только Сашенька. Хороший, воспитанный и, конечно, очень талантливый человек – музыкант и художник. «Не может быть, чтобы мой сын сам это придумал, – говорит мне вдруг Ирма Анатольевна, – это все его жена!» И смотрит тревожно – поверила ли? Она стесняется своих сдержанных слез, то и дело хрустально обволакивающих глаза, и я тихонько отворачиваюсь, чтобы не увеличивать своим вниманием боль и стыд женщины. Она просит не называть ее настоящие имя и фамилию в материале. Хотя сама позвонила в газету. Сама рассказала, что сын хочет подселить к ней квартирантов: он собирается сделать в доме отдельный вход и вообще разделить для удобства будущих арендаторов все пространство на участке в шесть соток на две неравные половины. Причем это все по закону, ведь большая часть дома принадлежит теперь ему по ее дарственной. Да, старой матери в итоге места в доме практически не останется. Ну и что? Человеку нужны деньги! Он ведь талант…

И материнское сердце разбито вдребезги. Она рассказывает и будто не верит своим словам: так ее родной сын – захватчик?

А ведь узел конфликта завязывался всего полтора года назад как по-писаному, как из учебника. Многое, наверное, можно было предвидеть. Мама вышла замуж. В преклонном возрасте. Личная жизнь, знаете ли, есть и у пожилых людей (особенно у пожилых, которым противопоказано одиночество!). Но взрослых детей это часто страшно возмущает: ишь, чего еще выдумали старые! Что же так раздражает наследников? Может быть, их волнует общественное мнение, какие-то условности, «приличия»? О господи, конечно нет. Собственность! Кому она достанется? Неужели придется делить ее с дядей (тетей)?

Вот и здесь тот же низменный катализатор чувств. Чтобы чужому не досталось ни пяди земли, ни метра загородного дома, сын и внучка Ирмы Анатольевны месяцами методично бомбардировали ее просьбами: «Сделай нам дарственную, бабушка, пожалуйста, сделай! Мы обещаем: твоя жизнь совершенно не изменится. Веришь?.. Ну, а иначе… Иначе, дорогая, мы к тебе больше ни ногой».

Как говорится, шантаж здесь тоже приветствуется.

Правду говорят, что мать порвет пазуху, детям носячи, а дети – от матери прячучи. Но это очевидно на холодную голову. А у матери к сыну холодного расчета быть не может. Ноту практицизма в ситуацию пытался внести муж Ирмы Анатольевны – человек солидный и, кстати, очень заслуженный. Мол, детям достаточно и завещания, зачем сразу дарственную, причем без всяких условий? Но женщину в порыве великодушия остановить уже было нельзя, она дарит сыну и внучке 75 процентов своего владения на дом и участок, оставив себе лишь четверть. Делает это, скажем прямо, против логики, опыта, против мнения мужа. Что поделаешь, родная кровь не водица, человек, конечно же, боится оборвать связи с семьей, хочет видеться и общаться с сыном и внучкой, желает всем мира и благоденствия. Тем более что безоговорочно верит в порядочность наследника. «Мой сын не такой!» – твердит она своему супругу и практически втайне от него уезжает к нотариусу.

Святая материнская любовь…

Но внутренняя пружина таких ситуаций достаточно примитивна: как только есть договор дарения, маски сбрасываются сами собой. Вылезает твоя истинная суть. Очень часто человек не может совладать с гаденьким чувством осознания своей скверной власти. Теперь можно ни с кем не считаться! Люди порой перерождаются на глазах.

Буквально через три месяца сын Сашенька после очередного кухонного конфликта с мужем Ирмы Анатольевны не сдерживается в эмоциях и грубо напоминает, что хозяин-то в загородном доме теперь он. Мужчины и раньше метали отравленные стрелы в друг друга: что поделаешь, два самца – наверное, ревность, конкурентность, амбиции. Возраст. И вот молодому представилась возможность отыграться на старом. Он напоминает в самой хамской форме, что теперь ему принадлежит большая часть недвижимости. И будет так, как он решил. А решил Сашенька, человек большой творческой души, в свою пользу, а старым (конечно же, дурням) – в наказание. Пока что, приказывает молодой волк, чтоб вас на кухне не было, когда я туда вхожу! И потребовал быстро освободить полхолодильника, а также пару кухонных шкафчиков в придачу. А любимая внучка, разгоряченная вкусом победы, предложила мужу бабушки вообще быстрее съехать в дом-интернат для ветеранов – мол, вы же заслуженный человек, у вас там будет отдельная комната, льготы. Опять же это рядом, в Ждановичах.

Какая добрая девушка!.. Такая доброта заслуживает того, чтобы на склоне дней эта особа услышала от потомков такие же сердечные напутствия в свой адрес. Только хватит ли ее заслуг на престижный дом престарелых? Вполне возможно, что ей-то как раз предложат всего лишь сельскую больничку. Бумеранг судьбы обычно редко промахивается.

Ну, а над Ирмой Анатольевной в тот момент разверзлись небеса. Да что говорить, с человека будто живьем начали снимать кожу. Да, ее, бывало, предавали мужчины, она знает вкус этих горьких потерь, но – сын?!. И женщина вдруг опомнилась: что же она наделала? Зачем ввергла своих близких в такое адское искушение собственностью, которое заставляет их терять человечность и самоуважение? Мать от безысходности готова во всем обвинить только себя. Сын в высокомерии чувствует себя хозяином положения. С тех пор он больше ни разу не позвонил, не приехал, не объяснился – понятно: в гневе чего только не наговоришь! Но потом остываешь и миришься с родными, тем более с матерью. Но, похоже, это были не только эмоции, но и четкий план действий.

В отчаянии Ирма Анатольевна подала в районный суд иск о признании недействительным договора дарения.

Надо ли говорить, что ей теперь предстоит пройти весьма непростой путь, итог которого может быть очень горьким? Первый суд она проиграла. Впереди следующие инстанции. Кстати, в наших судах подобных дел слушаются десятки. Детки иногда ничем не брезгуют, чтобы забрать себе родительскую собственность, не дожидаясь их естественного ухода, – случаются побои, настоящая угроза жизни. Но это, конечно, асоциальные личности – наркоманы, алкоголики, рецидивисты. В таких случаях договоры дарения расторгаются без проволочек. Здесь же к наследникам официально не придраться. А вот к Ирме Анатольевне вопросы есть. Назвать ее человеком, не управляющим собой, невозможно. Еще недавно она самостоятельно водила автомобиль, умеет пользоваться компьютером и вообще, слава богу, очень хорошо выглядит, несмотря на инвалидность II группы (возраст все-таки берет свое). Ирма Анатольевна – дама, а не старушка. Трудно доказать, что женщина была не в своем уме, когда подписывала договор дарения. В волнении – да. Но не в безумии… А то, что наследник желает практически выгнать мать из дома, так никакая инстанция не может осудить граждан за будущие деяния, ведь угрозы сына прозвучали на словах. Конечно, хочется надеяться на лучшее, на некую высшую справедливость, но есть ли у суда для этого, так сказать, инструментарий, буква закона? Остается только пожелать женщине мужества. Ей, матери, пришлось заглянуть в натуральную бездну и ужаснуться равнодушным и жадным глазам своего единственного сына, наследничка, которые победно взирают на нее оттуда. Мотайте на ус, уважаемые.

Елена МОЛОЧКО.

ПОМНІМ!

ЧАЛАВЕК У КАПЕЛЮШЫ

Міхась Расолька...

Радыёжурналіст. Дэпутат Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў (на пачатку дзевяностых, бадай, самага дэмакратычнага ў рэспубліцы). Старшыня дэпутацкай камісіі па сродках масавай інфармацыі. Ініцыятар, арганізатар і першы галоўны рэдактар не менш дэмакратычнай (а ў чыноўніцкіх колах – нават апазіцыйнай) сталічнай газеты "Добры вечар".

Памятаю, як ён зайшоў, не, не зайшоў, а літаральна заляцеў у мой пакой на чацвёртым паверсе Дома друку на тагачасным Ленінскім праспекце, 77, дзе на той час месцілася рэдакцыя маладзёжнай газеты "Чырвоная змена", у якой я працаваў намеснікам галоўнага рэдактара. Коратка распавёў пра стварэнне гарадской газеты, якая яшчэ не мела нават назвы (яе мы потым шукалі разам з дапамогай чытачоў), і тут жа прапанаваў: "Пойдзеш першым намеснікам галоўнага рэдактара?" "Калі рэдактар – мудак, то не", – адпарыраваў я. "Гэты мудак перад табой", – з усмешкай, але сур'ёзна адказаў Міхась. Так мы аказаліся на чале тады яшчэ не існуючага рэдакцыйнага калектыву.



Міхась Расолька не з'яўляўся членам Саюза пісьменнікаў, аднак сяброў сярод апошніх у яго было нямала. Ён быў частым госцем у Доме літаратара, ладзіў на яго сцэне творчыя вечарыны, заўсёды радаваўся набыткам айчынных пісьменнікаў, разам з імі перажываў за стан нацыянальнага кнігавыдання, як мог спрыяў, каб беларускае слова дайшло да чытача. Як прыватны выдавец, стаўшы ім пасля сыходу з "Добрага вечара", ён паспеў блаславіць на свет пяць кніг, у тым ліку тры мае – зборнікі пародый "Дуэль", "Дуэль-2" і пры падтрымцы Генадзя Грушавога чарнобыльскую паэму "Аварыя сумлення". Зрэшты, прэзентацыя першай з іх адбылася ў Доме літаратара з прамой трансляцыяй на Першым канале тэлебачання, што на сённяшні час здаецца неверагодным. І ўдзельнічалі ў ёй такія вядомыя асобы, як акцёры Генадзь Аўсяннікаў, Юрый Авяр'янаў і Віктар Манаеў, кампазітар Эдуард Ханок, спявачка Надзея Мікуліч. Сярод гледачоў былі Генадзь Бураўкін, Сяргей Грахоўскі, Мікола Гіль і іншыя вядомыя пісьменнікі.

Міхась Анатольевіч назаўсёды застанецца ў нашай светлай памяці як выдатны радыёжурналіст, як нястомны арганізатар многіх цікавых імпрэз, як прынцыповы і зычлівы сябар і паплечнік, урэшце – як чалавек-ідэя. Каб ажыццявіць задуманыя ім праекты, патрэбна не адно жыццё не аднаго дзясятка людзей.

Міхась любіў радавацца, але яшчэ больш любіў радаваць іншых. Ён быў сцэнарыстам, рэжысёрам і акцёрам на вялікай сцэне жыцця і, як вір, уцягваў у гэты спектакль кожнага, хто хоць аднойчы сутыкнуўся з ім. Памятаю, як у адзін год ён на 9 сакавіка арганізаваў для сваіх сяброў калектыўны культпаход у Тэатр оперы і балета па білетах, якія ўзяў у кіраўніцтва ў якасці ганарару за ўдзел у нейкім тэатральным праекце. Чаму менавіта на гэты дзень? А каб, як патлумачыў потым, прадоўжыць свята для жанчын!

Міхась Анатольевіч быў тым стрыжнем, на якім трымаліся ўсе: і бацькі Анатоль Герасімавіч і Ніна Мікітаўна, і сястра Ала з братам Валікам, і жонка Тамара (Томушка, як ён пяшчота называў яе), і дзве маленькія дачушкі Анюта і Даша (цяпер абедзве за мяжой: першая – у Швейцарыі, другая – у Маскве), і мы – яго сябры, нават тыя, хто з ім сутыкнуўся аднойчы, а вось запомніў назаўсёды.

Пра яго цяжка гаварыць у мінулым часе. Бо такія людзі, як Міхась, нават пайшоўшы з жыцця, не пакідаюць нас. Іх дух, іх ідэі вечна клічуць наперад, не даюць супакойвацца на дасягнутым, разменьвацца на дробязі. І ў гэтым быў таксама ўвесь ён, Міхась Расолька – ігрок! Бо для яго не існавала дробязяў. Усё, за што браўся Міхась, заўсёды рабілася прыгожа. Невыпадкова ж, калі ён ажыццяўляў нейкі свой праект, то звычайна казаў: "Гэта павінна быць цукерачка".

Гэтага чалавека ў капелюшы ў Мінску ведалі многія. Няўрымслівага і энергічнага – чалавека, які, здавалася, не хадзіў па зямлі, а лётаў.

Міша. Міхась. Міхась Анатольевіч. Ён трагічна загінуў на 47-м годзе жыцця. Я так і не ведаю, што штурхнула яго, такога жыццялюба, на самазабойства. 17 лютага Міхасю Расольку споўнілася б семдзесят. Мы, яго сябры, адзначылі гэтую знамянальную дату. На вялікі жаль, без яго.

Анатоль ЗЭКАЎ.

СІТУАЦЫЯ

Футбольным клубам паставілі ўльтыматум?

Нагадаем, што напярэдадні таварыскіх матчаў з 19 па 27 лютага адбудзецца збор нацыянальнай каманды, хаця яе склад дакладна не вядомы, бо брэсцкае "Дынама", барысаўскі БАТЭ і салігорскі "Шахцёр" адмовіліся адпускаць сваіх футбалістаў у размяшчэнне зборнай Беларусі.

Учора ў Міністэрстве спорту адбылася нарада, на якой разглядаўся ў тым ліку і гэты канфлікт інтарэсаў.

Як інфармуе by.tribuna.com са спасылкай на аднаго з удзельнікаў сустрэчы, міністр спорту Сяргей Кавальчук заявіў, што клубы, якія не адпусцяць ігракоў у зборную на таварыскія матчы з камандамі Узбекістана і Балгарыі, пазбавяцца дзяржаўнай падтрымкі.

ТЕННИС

Когда играем?

Стало известно расписание финала Кубка федерации-2020, который пройдет в Будапеште с 14 по 19 апреля.

С 14 по 17 апреля состоятся игры группового этапа. Команда Беларуси попала в группу "B", где сыграет с представителями Австралии и Бельгии. Каждый матч будет состоять из трех поединков – двух одиночных (первые и вторые ракетки сыграют между собой) и парного.

16 апреля сборная Беларуси сыграет с командой Бельгии, а 17 апреля сразится с Австралией.

Напомним, команда-победительница из этой группы разыграет 18 апреля путевку в главный финал с сильнейшей сборной группы "D" (Чехия, Германия, Швейцария).

19 апреля состоится финал.

Сергей НИКАНОРОВ.

ГАЗЕТА – ЧЫТАЧЫ

Калі хочаш лепшай долі – Дапамажы «Народнай Волі». У свеце ПРАЎДЫ жыць імкніся, На газету падпішыся!


Каб атрымліваць "Народную Волю" з 1 сакавіка, неабходна аформіць падпіску ў любым паштовым аддзяленні ці ў спецыялізаваных пунктах "Белсаюздруку" на працягу бліжэйшага тыдня.



ШАХМАТЫ

Чытач – чытачам

Сваю новую задачу-мініяцюру даслаў нам **Міхаіл Кошаль** з Мінска.



Белыя: Крe6, Фа3, Лh2, пп. d4, h4 (5).

Чорныя: Крe4, пf5 (2).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі ***(220030 г.Мінск, вул. Энгельса, 34а)*** або на электронны адрас: ***vadim_ne67@mail.ru.***

Прыступка да вяршыні

У Мінску адбыўся першы этап чэмпіянатаў краіны сярод мужчын і жанчын (турнір неафіцыйна завецца "першай лігай"). У вышэйшую лігу траплялі па чатыры лепшыя ўдзельнікі.

У мужчынскім турніры сярод 77 гульцоў было чатыры гросмайстры, пяць міжнародных майстроў, дзевяць майстроў ФІДЭ і адзін жаночы майстар ФІДЭ (чэмпіёнка Беларусі Аляксандра Тарасенка). 1–2-е месцы падзялілі майстар ФІДЭ Манвел Пагасян і гросмайстар Яўген Падольчанка – па 7 балаў з 9. На 3–6-м месцах – майстры ФІДЭ Дзяніс Лазавік і Максім Царук, міжнародныя майстры Вячаслаў Зарубіцкі і Віталь Мерыбанаў (у такім парадку іх вызначылі дадатковыя паказчыкі). З гросмайстраў Віталь Цецераў быў 15-ы, Мікіта Маёраў – 17-ы, Ігар Люцко – 23-і. Саша Тарасенка фінішавала 32-я.

Дзяніс Лазавік – Антон Шарамет

1.d4 f5 2.Кf3 g6 3.g3 Сg7 4.Сg2 Кf6 5.0-0 0-0 6.b3 c5 7.e3 Кe4 8.Сb2 Кc6 9.c4 d6 10.Кc3 К:c3 11.С:c3 Фc7 12.Лc1 Лd8 13.d5 С:c3 14.Л:c3 Кe5 15.e4 e6 16.К:e5 de 17.ef ef 18.Лe3 Фd6 19.Лfe1 e4 20.f3 ef 21.Ф:f3 Сd7 22.Фf4 Ф:f4 23.gf Лe8 24.d6 Л:e3 25.Л:e3 Сc6 26.С:c6 bc 27.Лe7 Лd8 28.d7 Крf8 29.Л:h7 Крg8 30.Лe7 Крf8 31.Лe8+ Л:e8 32.deФ+ Кр:e8 33.Крf2, 1:0.

У жанчын сярод 25 удзельніц перамагла Ксенія Зелянцова (7,5 бала з 9), 2-е месца заняла адзіны ў турніры майстар ФІДЭ Кацярына Бейненсон, яшчэ дзве пуцёўкі атрымалі Ксенія Норман і Аліна Сукаліна.

Рэната Аюшава – Кацярына Бейненсон

1.d4 d5 2.Сf4 Кf6 3.Кf3 c5 4.c3 Кc6 5.e3 Фb6 6.Фb3 c4 7.Ф:b6 ab 8.Кa3 Сf5 9.Кh4 Сg6 10.К:g6 11.Кc2 e6 12.Сe2 b5 13.b4 Кe4 14.a3 К:c3 15.Сf3 Сe7 16.Крd2 Кe4+ 17.Крe2 g5 18.С:e4 gf 19.Сf3 fe 20.fe Сd6 21.g3 Крd7 22.Крf2 g5 23.h3 f5 24.Лae1 Лag8 25.Лeg1 Кe7 26.Крe1 Лg7 27.Крd2 Лgh7 28.Сg2 С:g3 29.С:d5 К:d5 30.Л:g3 g4 31.Крe2 Кc3+ 32.Крf1 Кe4, 0:1.

Аршанскі фэст

Традыцыйны шахматны фестываль прайшоў у Оршы. У гросмайстарскім турніры сярод 10 удзельнікаў былі тры гросмайстры, чатыры міжнародныя майстры і два майстры ФІДЭ. Перамог расійскі гросмайстар Вадзім Майсеенка, 2–4-е месцы падзялілі юны майстар ФІДЭ Дзяніс Лазавік (Беларусь), міжнародны майстар Уладзіслаў Наздрачоў (Расія) і майстар ФІДЭ Міхаіл Брыкін (Расія). У майстарскім турніры (10 удзельнікаў, у тым ліку тры міжнародныя майстры і шэсць майстроў ФІДЭ) 1-е месца заняў Ілля Макалееў (Расія), 2-е – Дзмітрый Кананенка (Украіна), 3-е – Кацярына Гольцава (Расія), а лепшы вынік сярод беларусаў (4-е месца) паказаў Іван Рунец. Усе чацвёра згаданых шахматыстаў маюць званне майстра ФІДЭ.

Адін дзень і ўвесь свет

Ужо 16-ы раз запар у свеце прайшоў Міжнародны інтэрнэт-турнір па рашэнні: у адзін дзень адбыліся спаборніцтвы ў 43 гарадах 32 краін. Удзельнікі рашалі аднолькавыя заданні, а іх вынікі былі зведзены арганізатарамі ў агульную табліцу. У першай катэгорыі выступалі 202 рашальнікі, у тым ліку пяць беларусаў, якія змагаліся ў горадзе Клічаве. Лепшым тут быў Віктар Зайцаў – 44,5 бала з 60 магчымых (у агульным заліку ён падзяліў 33–36-е месцы). Другі з нашых рашальнікаў – Аляксандр Булаўка, на рахунку якога 44 балы (37-е месца ў свеце). Наступныя месцы занялі адпаведна Аляксандр Міхалап, Міхаіл Храмцэвіч і Уладзімір Барташ. Судзіў турнір у Клічаве Мікалай Сігневіч. Тры прызавыя месцы ў сусветным заліку занялі адпаведна Ульрых Войгт (Германія), Каспер Піярун (Польшча) і Яўген Віктараў (Расія). У другой катэгорыі змагаліся аматары (з рэйтынгам да 2000), у трэцяй – дзеці да 13 гадоў. Тут беларускіх удзельнікаў не было.

Беларускія рашальнікі ўзялі ўдзел у двух турнірах у Маскве: XIV Кубку часопіса "Уральскі праблеміст" і Кубку Расійскага дзяржаўнага сацыяльнага ўніверсітэта (Мемарыяле А.Пачынка). У абодвух спаборніцтвах Аляксандр Булаўка быў шосты, а Мікалай Сігневіч заняў адпаведна 9-е і 18-е месцы.

Праверце адказы

Задача М.Быкава, змешчаная ў "Народнай Волі" 28 студзеня, рашаецца: **1.Фb1!**, а пазіцыя з партыі М.Падгаец–В.Купрэйчык: **1…Фe3!**


Не рашае задачу ход 1.Лb7?, які прапанаваў Леанід Калодка, з-за адказаў 1…Сd3 (Сe2, Сf1)!

Першымі правільна рашылі **Васіль Жуковіч, Славамір Буката, Мікалай Шклярэўскі, Сяргей Галкін, Ігар Ананіч, Віктар Жук**.

Вадзім ЖЫЛКО.

КРЫЖАВАНКА

Футбольная мазаіка



Па гарызанталі: 1.Зімні від спорту. 2.Дубліруючая футбольная каманда або два галы, забітыя адным іграком у адным матчы. 4.Міжнародная федэрацыя футбола, створаная ў Парыжы ў 1904 годзе (абрэв.). 7.Спартыўны калектыў. 8.Род твораў у галіне якога-небудзь мастацтва. 9.Першы ў спартыўным спаборніцтве. … 29-га чэмпіянату Беларусі па футболе сярод каманд вышэйшай лігі – футбольны клуб "Дынама" з Брэста (капітан каманды П.Няхайчык). 11.Нарасць ад гарэння. 12.Пачатковыя веды. 14."Цудоўны … , удар – і мяч ляціць у дзявятку" – з песні невядомага аўтара "Трус не гуляе ў футбол", выкананай Таісіяй Паваліій. 15.Снарад для гульні ў бадмінтон. 17.Частка нагі. 18."А першы …, як першае каханне!" – з верша Ул.Верамейчыка "А першы …". 19.У футболе і хакеі – ігрок нападзення. 23."Белая казка. … беларуская!" – з верша Н.Гілевіча "Белыя сыплюцца долу крышталікі". 24.Момант пачатку спартыўных спаборніцтваў. 25.Арбітр, суддзя на полі.

Па вертыкалі: 1. … год канчае, зіму пачынае (прык.). 2. … у коміне слупам – да халадоў (прыкм.). 3."Там празрысты звонкі … , // Там вясёлы карагод" – з верша Д.Бічэль-Загнетавай "Мае канькі". 4.Нота музычнай гамы. 5.Падтрымка. 6."За вакном сягоння // Зноўку …" – з верша Ю.Півунова "Снежны зоркапад". 10.Вядзенне мяча або шайбы іграком. 13."І вясёлыя дзеці на ганку, // І на дрогкім кусце … , // І канькі, і нястомныя санкі" – з верша Т.Дзям'янавай "Не надыхацца, не наталіцца". 16.У футболе недакладны пас, які быў перахоплены сапернікам. 20.Усходні вецер. 21.Выхад мяча за бакавую лінію. 22.Танцавальны шаг.

Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 1.Слалам. 2.Дубль. 4.ФІФА. 7.Каманда. 8.Жанр. 9.Лідар. 11.Нагар. 12.Азы. 14.Пас. 15.Валан. 17.Бядро. 18.Снег. 19.Форвард. 23.Зіма. 24.Старт. 25.Рэферы.

Па вертыкалі: 1.Снежань. 2.Дым. 3.Лёд. 4.Фа. 5.Апора. 6.Снегапад. 10.Дрыблінг. 13.Снегіры. 16.Абрэз. 20.Ост. 21.Аўт. 22.Па.

Лявон ЦЕЛЕШ.

г.Дзяржынск.

Калектыў рэдакцыі газеты "Народная Воля" выказвае глыбокае спачуванне вядучаму бухгалтару Людміле Пятроўне Улога ў сувязі з яе вялікім горам – трагічнай смерцю 18-гадовага сына Яна.

Падпісацца на «Народную Волю» можна ў любы дзень у любым паштовым аддзяленні ці ў спецыялізаваных пунктах «Белсаюздруку».



Адрас рэдакцыі: 220030 Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 328-68-71.
Рэкламны аддзел (017) 328-66-09.
nvonlineinfo@gmail.com
http://www.nv-online.info

Падпісныя індэксы:
63222 – для індывідуальных падпісчыкаў,
632222 – для прадпрыемстваў і арганізацый.

Заснавальнік, выдавец і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

 Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні дзяржаўнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 17.02.2020 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 22 007 экз. Заказ № 542.